# РАБОТА ДУШЫ

## Пабудова асацыятыўных радоў на ўроках музыкі

Любая творчая дзейнасць чалавека, у тым ліку і музычнае ўспрыняцце, абумоўлена багаццем і разнастайнасцю асацыятыўных уяўленняў. Яны маюць прадметна-зрокавы, эмацыянальна-пачуццёвы, цялесна-маторны, прасторавы, гукамоўны, жанравы, стылёвы і іншы характар. Па-рознаму яны бываюць прадстаўлены ў кожнага канкрэтнага чалавека. Прырода асацыятыўных уяўленняў даследавана ў навуцы недастаткова. Але і тое, што ўжо вядома, не ў поўнай меры выкарыстоўваецца на практыцы.

Педагог часта задавальняецца апісальнымі характарыстыкамі музычнага зместу, якія даюцца вучнямі. Прадметна-зрокавая накіраванасць асацыяцый займае пры гэтым, як правіла, пераважнае месца. Літаратурнымі ці проста надуманымі сюжэтамі дзеці нярэдка падмяняюць музычны змест, нівеліруючы тым самым яго мастацкую вартасць і вобразна-эмацыянальную непаўторнасць.

У сваёй методыцы мы стараемся як мага часцей звяртацца да інтанацыйнага вопыту вучняў, што надзвычай важна для развіцця асацыятыўнага мыслення дзіцяці, разумення ўзаемасувязі музыкі з жыццём, са светаадчуваннем чалавека. Інтанацыя ў музыцы цесна звязана з чалавекам ужо на псіхафізіялагічным узроўні — з яго мовай, рухамі, мімікай, пластыкай. Гэта дазваляе знаходзіць сувязі зместу музыкі з жыццёвым вопытам дзяцей, паспяхова выкарыстоўваць у працэсе аналізу музыкі вынікі іх уласнага інтраспектыўнага аналізу інтанацыі.

Вельмі важна развіваць у школьнікаў здольнасць інтуітыўнага адчування змястоўнасці музычнай інтанацыі, фарміраваць навыкі спасціжэння адлюстраванага ў ёй эмацыянальнага стану. Толькі так адбываецца засваенне імі своеасаблівай азбукі людскіх пачуццяў. Без гэтага немагчымы рух наперад у станаўленні культуры музычнага выхавання дзіцяці. Задачы гэтыя не простыя і не могуць вырашыцца самі сабою, без кіраўніцтва педагога.

Пакажам асобныя элементы нашай методыкі на прыкладзе аналізу п'ес з "Дзіцячага альбома" П. І. Чайкоўскага — "Хвароба лялькі", "Новая лялька", "Няньчына казка", "Баба Яга".

Музыка вялікіх кампазітараў, напісаная спецыяльна для дзяцей, амаль заўсёды захоўвае рэмінісцэнцыі дзяцінства саміх аўтараў, і ў гэтым яе асаблівая мастацкая вартасць і педагагічная перспектыўнасць. "Дзіцячы альбом" адкрывае шырокія магчымасці для актывізацыі эмацыянальна-вобразнай сферы дзяцей.

Мастацкі ўзровень твораў "Альбома" не выклікае сумненняў. Разам з тым яны незаслужана рэдка гучаць у дзіцячай аўдыторыі, хаця маглі б быць паспяхова выкарыстаны ў педагагічным працэсе, напрыклад, пры вывучэнні такіх тэм праграмы, як "Пра што гаворыць музыка", "Інтанацыя", і іншых.

### ХВАРОБА ЛЯЛЬКІ

— "Дзіцячы альбом" кампазітар прысвяціў свайму пляменніку Валодзю Давыдаву. Магчыма, у Валодзі была любімая лялька. Аднойчы хлопчыку здалося, што лялька захварэла. Так часта бывае ў жыцці, гэта можа здарыцца з кожным. Паслухаем, які настрой перадае кампазітар у сваёй п'есе.

**Сумны**
**Вясёлы**
**Урачысты**

Дзеці звычайна без цяжкасці вылучаюць сумны настрой, адлюстраваны ў музыцы. Звяртаемся да інтанацыйна-моўнага вопыту дзяцей і звязаных з жыццёвымі праявамі смутку асацыяцый. Разам з вучнямі ўспамінаем, як сумны настрой звычайна адбіваецца ў мове. Як мы ў такіх выпадках гаворым?

**Хутка або павольна**
**Гучна або ціха**
**Плаўна або адрывіста**

Высвятляем, што ў музыцы сумны настрой перадаецца ў павольным тэмпе, ціха, у плаўным развіцці мелодыі. Па сутнасці, гэта сума важнейшых сродкаў выразнасці, з дапамогай якіх у музыцы мадэліруецца жыццёвая эмоцыя смутку. Аднак на гэтым мы пакуль не засяроджваем увагу школьнікаў. Больш істотнае асэнсаванне фізіялагічных асноў эстэтычнай эмоцыі смутку, даступнае дзіцяці. У прыватнасці, цікавы аналіз дыхання, уласцівы смутку. Вызначаем яго з дапамогай эпітэтаў.

**Хуткае**
**Павольнае**
**Перарывістае**

А затым прапануем разгледзець і выбраць адну са схем дыхання, якая ў найбольшай ступені адлюстроўвае характар эмоцыі смутку:





Слухаем фрагменты твора і "малюем" у паветры рухам рукі схему першага графіка, а затым другога. Параўноўваем іх і выбіраем патрэбны графік, зноў "малюем" яго, а таксама ціха і плаўна дыхаем у адпаведнасці з музычнай фразіроўкай п'есы.

Адзначаем, што так і мы паводзім сябе, калі ў нас бывае сумны настрой: павольна гаворым, дыхаем не спяшаючыся, з прыпынкамі.

— Ці бываў у вас сумны настрой? З чым гэта было звязана? Успомнім такія выпадкі і паслухаем музыку яшчэ раз. Падзівімся, як кампазітару ўдалося так прыгожа, па-майстэрску перадаць сумны настрой гукамі. Як бы вы ацанілі гэты твор?

| | |
|---|---|
| **Падабаецца** | **Не падабаецца** |
| **Вельмі падабаецца** | **Пакідае раўнадушным** |

Просім дзяцей растлумачыць, чаму яны вырашылі ме-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

навіта так ацаніць музыку. Чым яна спадабалася ці, наадварот, не спадабалася ім? Такія пытанні асабліва дарэчы пры аналізе твораў, напісаных у мінoры. Яны даюць вялікую прастору для фантазіі дзяцей. Сумесны з вучнямі аналіз ацэнак набывае выхаваўчае значэнне, таму што выказванні пра музыку ў такіх выпадках пераплятаюцца з маральным вопытам дзяцей, з падзеямі іх жыцця і жыцця іншых людзей.

## НОВАЯ ЛЯЛЬКА

— А ў гэтай п'есе ўжо іншы настрой. Раскажыце, які ён.

**Сумны**
**Задуменны**
**Радасны**

— Якія рухі вам хочацца рабіць пад гэту музыку?

**Кружыцца**
**Бегаць**
**Падскокваць**

— Што гэта — песня або танец? Ці тое і другое адначасова?

Звяртаем увагу на характар музычнай мовы: кароткія мелодыі, рухавы тэмп, рытм вальса. Нібы нехта вымаўляе ласкавыя словы. Ад іх радасна замірае сэрца і хочацца кружыцца. Так у музыцы перадаецца радасны настрой.

— Зараз, калі вы будзеце слухаць іншыя музычныя творы, то пачуцці, падобныя на гэтыя, адразу пазнаеце і здагадаецеся, пра што расказвае музыка. Успомніце, ці быў у вас такі настрой. З чым гэта было звязана?

У заключэнне слухаем п'есу яшчэ раз, імітуючы ласкавае гушканне ўяўнай лялькі на руках.

— Калі б вам давялося перадаць на малюнку ўражанні аб п'есах "Хвароба лялькі" і "Новая лялька", то якія колеры вы б выкарысталі?

Выкананне такога дамашняга задання ўяўляе для настаўніка вялікую цікавасць. З аднаго боку, у малюнках можа адбіцца ступень разумення вобразнасці музыкі, з другога — раскрыцца характар асацыятыўных уяўленняў вучняў.

Так, напрыклад, цьмяныя фарбы пры перадачы ўражанняў ад п'есы "Хвароба лялькі" могуць сведчыць аб імкненні дзіцяці стварыць вобраз смутку. Спроба ж намаляваць проста ляльку без уліку колеру і каларыту паказвае больш на асацыятыўны бок творчай фантазіі (сама тэхніка малюнка і мастакоўскія здольнасці значэння тут не маюць). Могуць таксама ўзнікнуць і іншыя, больш аддаленыя ад музычнага вобраза асацыятыўныя рады, ускосна звязаныя са зместам музыкі.

Што рабіць настаўніку, калі ён зразумее, што заданне выканана не самім вучнем, а кім-небудзь з дарослых, аднак малюнак даволі дакладна адлюстроўвае характар зместу музыкі і па колеру, і па майстэрству, і па тэхніцы выканання? Мы ў такіх выпадках робім усё-такі пазітыўную выснову, мяркуючы, што дзіцяці ўдалося дома пераканаўча перадаць словамі эмацыянальную атмасферу ўрока і змест музыкі, намаляваць вобраз словамі. А гэта ўжо добра само па сабе.

## НЯНЬЧЫНА КАЗКА

У самой назве п'есы закладзена праграма, якая арыентуе слухача на ўспрыняцце музыкі як своеасаблівага музычна-моўнага жанру. Казка — заўсёды мова, заўсёды расказ аднаго чалавека другому, часцей за ўсё дарослага — дзіцяці. І гэта неабходна ўлічваць у рабоце. Не трэба, ды і практычна немагчыма дакладна адгадаць літаральны змест казкі. Разам з тым вельмі важна выявіць саму інтанацыю аповеду. Дасягнуць гэтага можна толькі сродкамі даступнага дзецям інтанацыйнага аналізу. У процілеглым выпадку ўсё ўспрыняцце можа звесціся да адгадвання і апісання толькі знешніх прыкмет персанажаў казкі ці самой нянькі.

У гутарцы высвятляем значэнне слова **нянька**. Раней у многіх сем'ях дзяцей даглядалі нянькі. Перад сном па вечарах яны звычайна расказвалі ім цікавыя гісторыі і казкі.

— Сёння мы паслухаем незвычайную казку. У ёй няма слоў, яе змест перадаюць толькі гукі. Аднак вы, напэўна, зможаце здагадацца, пра што ў ёй гаворыцца, калі ўважліва ўслухаецеся ў музыку і паспрабуеце ўспомніць усе казкі, якія чулі, чыталі ці бачылі раней.

На гэтую частку методыкі звяртаем асаблівую ўвагу. Успаміны пра ўжо вядомыя казкі дапамагаюць "узарваць" асацыятыўную памяць дзяцей, што з'яўляецца адной з умоў пабудовы адэкватных мастацкаму зместу асацыятыўных радоў.

Перад праслухоўваннем тлумачым вучням, што ў музыцы мы пачуем тры часткі, дзве з якіх (першая і трэцяя) падобныя і паўтараюцца, а сярэдняя адрозніваецца ад іх. З дапамогай рознакаляровых кружочкаў выкладваем схему формы на дошцы:



— А зараз заплюшчым вочы і праслухаем п'есу з пачатку да канца. (Слуханне з заплюшчанымі вачыма дазваляе настаўніку назіраць за працэсам успрыняцця музыкі, прадухіляе эфект "паваленых дошчачак даміно", калі дзеці паводзяць сябе па ўзору аднаго з вучняў, што сядзіць на першай парце.)

Просім вучняў вызначыць, ці сустракаюцца ў п'есе месцы, дзе расказваецца пра нешта страшнае. Таму, хто заўважыць гэта, прапануем прылегчы на парту і закрыць твар рукамі. Высвятляецца, што "страшныя месцы" сустракаюцца ў другой частцы. Тут, напэўна, расказваецца аб нейкім злым персанажу. Не мае значэння, аб кім канкрэтна, кожны слухач выкарыстоўвае свой запас асацыяцый. Любое ўспрыняцце індывідуальнае і непаўторнае, аднак агульныя заканамернасці ўсё ж маюцца. Яны ляжаць у плоскасці нарматыўных асацыятыўных уяўленняў дзяцей. Гэта — асацыяцыі мастацкага тыпу. Само адчуванне адэкватнасці іх зместу музыкі прыносіць слухачу эстэтычную асалоду.

— Але пра што расказваюць першая і трэцяя часткі?

Аналізуючы іх, прапануем вызначыць уяўную мову нянькі з дапамогай эпітэтаў.

**Усхваляваная**
**Апавядальная**
**Раўнадушная**

Прапануем выбраць адзін з рухаў рук, які падышоў бы для характарыстыкі мовы нянькі: развесці рукі ў бакі, плаўныя рухі перад корпусам, рух указальнага пальца ля куточка вуснаў. Усё гэта робім у адпаведнасці з рытмічным малюнкам мелодыі:






Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Рух пальчыка ля вуснаў выбіраецца дзецьмі як аптымальны. Супастаўляючы яго з рознымі слоўнымі характарыстыкамі, прыходзім да высновы, што лепш за ўсё ён спалучаецца з азначэннем **апавядальная**. Якая думка можа суправаджацца такім рухам? "Быццам нехта папярэджвае", — аднадушна адказваюць дзеці. Так вучні інтуітыўна засвойваюць выражаную ў музыцы інтанацыю папярэджвання, якая з'яўляецца варыянтам апавядальнай інтанацыі. Яна маецца ў жыццёвым вопыце дзяцей і лёгка пазнаецца ў музыцы пасля таго, як на гэта будзе звернута іх увага.

Аднак аб чым жа папярэджвае слухача кампазітар у першай частцы? Ды хутчэй за ўсё аб тым, што ў другой будзе расказана аб нейкім "страшным персанажу". І гэта, як мы ўжо ўпэўніліся, падмацавана адпаведнай музыкай. Але аб чым жа тады папярэджвае ён нас у трэцяй частцы? П'еса ж ужо закончылася... Перагорнем старонку "Дзіцячага альбома" і знойдзем адказ — наступны твор называецца "Баба Яга".

Дык вось чаму ў "Няньчынай казцы" сустракаліся "страшныя месцы", вось пра што яна папярэджвала нас! І як дасціпна выбрана кампазітарам форма твора!

У заключэнне слухаем п'есу яшчэ раз, паўтараючы адабраныя ў працэсе аналізу дзеянні: у першай і трэцяй частках рух пальца ля куточка вуснаў, у другой усе затойваюцца і закрываюць твар рукамі. "Няньчына казка" з гэтага часу робіцца для вучняў адным з самых любімых твораў.



## БАБА ЯГА

— Ці сапраўды такая страшная Баба Яга? Уважліва паслухаем музыку. Калі яе гучанне параўнаць з мовай, якое слова вы выбралі б для азначэння інтанацыі?

**Усхваляваная**
**Раўнадушная**
**Урачыстая**

— Звярніце ўвагу, як падкрэслівае ўсхваляванасць музычнай інтанацыі гучнасць і хуткасць выканання. Ці заўважылі вы рэзкія ўдары, нібы нехта стукае нагой? Слухаем і адзначаем такія месцы, пляскаючы ў далоні. Калі ў жыцці чалавек гаворыць хутка і гучна ды яшчэ прытупвае нагой, з якім пачуццём гэта бывае звязана?

| | |
|---|---|
| **Пяшчотным** | **Злым** |
| **Добрым** | **Задуменным** |

Прыходзім да высновы, што ў музыцы перададзена эмоцыя злосці. Звяртаем увагу на частату змены дыхання ў перадачы інтанацыі злосці. Параўноўваем, ці так гэта праяўляецца ў мове. Якая схема дыхання больш падыходзіць для характарыстыкі злосці?





— Якія рухі спадарожнічаюць выказванню такіх пачуццяў у жыцці?

**Плаўныя**
**Мітуслівыя**

— Якой вы ўяўляеце сабе Бабу Ягу? Намалюйце словамі яе партрэт.

Прапануем ацаніць музыку пры дапамозе эпітэтаў.

| | |
|---|---|
| **Цікавая** | **Грубая** |
| **Захапляючая** | **Непрыгожая** |

У заключэнне слухаем п'есу яшчэ раз. Пляскаем у далоні на акцэнтуемых акордах. Лёгкімі рухамі кісцей рук імітуем палётнасць мастацкага вобраза. Просім дзяцей падрыхтаваць да наступнага ўрока малюнкі, звязаныя з іх уражаннямі ад п'есы.

Высвятляецца, што ў музыцы перададзены вобраз злосці, але ў ім толькі нешта ўгадваецца ад звычайнай, жыццёвай эмоцыі злосці, не больш. Дзеці ўжо зразумелі прыгажосць мастацкага вобраза.

Успрыняцце п'есы магло б пайсці па іншаму шляху, калі б мы акцэнтавалі іх увагу на знешніх прыкметах персанажа: твары, касцяной назе, ступе і інш. А гэта — шлях да вульгарызацыі музыкі. Зараз жа дэталі могуць дадумвацца дзіцем, але ўжо як прадметна-зрокавае дапаўненне да эстэтычнай эмоцыі злосці, выказанай гукамі. І ў гэтым заключаецца выхаваўчае значэнне ўрока, бо перaадольваюцца няправільныя ўяўленні пра музыку як пра мастацтва, здольнае толькі ілюстраваць тыя ці іншыя падзеі і з'явы жыцця.

* * *

Зварот да асацыятыўнага вопыту дзяцей садзейнічае актывізацыі іх музычнага ўспрыняцця, надае яму эмацыянальную насычанасць і змястоўнасць. Мастацкае ўспрыняцце — гэта заўсёды праца, работа душы і думкі, а не пасіўнае карыстанне. Эстэтычныя перажыванні не ўзнікаюць самі сабою, яны нараджаюцца ў выніку стваральнай дзейнасці розуму і сэрца. І гэта неабходна выхоўваць на ўроках музыкі.

**В. П. РЭВА,**
**кандыдат педагагічных навук, дацэнт,**
**загадчык кафедры музычнага выхавання**
**Магілёўскага педагагічнага інстытута**
**імя А. Куляшова.**



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова